Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

АЎТОРАК
15 верасьня 1931 г.
№ 214 (3303)

Фінплян рэальны, яго можна і трэба выканаць

Вял'зарнейшыя дасягненьні ва ўсіх галінах сацыял'стычнага будаўніцтва, індустрыялізацыя краіны, сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, далі магчымасьць Савецкай краіне ў 1931 годзе перайсьці да адз'нага фінансавага пляну.

М'ж выкананьнем усяго народна-гас падарчага пляну і выкананьнем адзінага фінансавага пляну ў частцы сацыялістычнага накапленьня фінансавых сродкаў існуе непарыўная сувязь і зусім правільна аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) у сваёй рэзалюцыі аб народна-гаспадарчым пляне 3-га рашаючага году асабліва падкрэсьліў, што «бяз строгага выкананьня фінансавага пляну немагчыма ажыцьцяўленьне намечанага гаспадарчага пляну ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі». Выкананьне фінпляну 3-га кварталу, да канца якога засталося ўсяго паўтары дэкады, набывае выключна вялікае значэньне.

Фінплян 3-га кварталу—рашаючага году пяцігодкі ў БССР на 1 верасьня выкананы толькі на 48,5 проц. Тыя зьвесткі, якія ў нас маюцца, сьведчаць аб недапушчальна агідных адносінах з боку кіраўнікоў паасобных раёнаў да справы прыцягненьня сродкаў насельніцтва.

Абавязковыя плацяжы (сельгаспадатак, страхоўка) у 3-м квартале займаюць пераважнае месца ва ўсім фінансавым пляне БССР.

Тэрмін першага ўзносу па сельгаспадатку і страхоўцы скончыўся яшчэ 31 жніўня, да гэтага часу паўнавартасна было быць забясьпечана поўнае паступленьне гэтых плацяжоў, але выкананьне пляну на 1 верасьня па сельгаспадатку складае толькі 58 проц. і 30 проц. па страхоўцы.

Ёсьць такія раёны, якія паказалі ўзорныя прыклады працы ў справе спагнаньня страхоўкі і сельгаспадатку. Напрыклад Сіроцінскі раён выканаў свае заданьне па сельгаспадатку на 48,4 проц. і 44,1 проц. па страхоўцы. Церахоўскі—42,7 проц. Але побач з гэтым ёсьць шмат такіх раёнаў, дзе недаацэньваюць справу мабілізацыі сродкаў, па апартуністычнаму адносяцца да спагнаньня абавязковых плацяжоў. Да такіх раёнаў адносяцца Бабруйскі, Расонскі, Плешчаніцкі і Уравіцкі, выкананьне плянаў у якіх па сельгаспадатку і страхоўцы не дасягае нават і 10 проц. Ёсьць і такія раёны дзе яшчэ ніводнага рубля не спагнана сельгаспадатку (Шклоўскі і Бешанковіцкі р.).

Мы маем такія зьявішчы, калі замест правільнага падыходу да абкладаньня сельгаспадаткам серадняка, поўнага выяўленьня кулацка-заможных гаспадарак, у цэлым радзе раёнаў БССР на глядаюцца грубейшыя парушэньні дырэктыў партыі і ўраду ў падатковай рабоце. Кіраўнікі паасобных раёнаў па апартуністычнаму адносяцца да кулака.

Ёсьць дырэктыва аб тым, каб да 1-га верасьня цалкам спагнаць с-г падатак з кулацка-заможных гаспадарак, але такія раёны, як Лёзьненскі, Лельчыцкі, Чашніцкі, Камарынскі, Шкловскі, Бешанковіцкі да гэтага часу ніводнага рубля не спагналі с-г падатку і страхоўкі.

Побач з апартуністычнымі адносінамі да кулака мы дзе-ні-дзе наглядаем і «лявацкія» перагібы ў адносінах да серадняка.

Вялікую ролю ў справе мабілізацыі грашовых сродкаў адыгрываюць ашчадкасы, але і на гэтым вучастку работы ў БССР маюцца ганебныя прарывы. Плян мабілізацыі сродкаў па ўкладах у ашчадкасы за два месяцы (ліпень-жнівень) выкананы ўсяго на 19,5 проц. Апошняя дэкада жніўня дала яшчэ горшае выкананьне пляну. Гэта тлумачыцца тым, што апарат ашчадкас па апартуністычнаму адносіцца да справы мабілізацыі сродкаў насельніцтва.

Рэалізацыя акцый трактарацэнтру мае ня менш важнае значэньне ў справе прыцягненьня грашовых сродкаў, але калгасная сыстэма, сыстэма сельгаскаапэрацыі паасобных раёнаў БССР праяўляюць яўны апартунізм у галіне распаўсюджваньня акцый трактарацэнтру, дзякуючы чаму заданьне на сёньняшні дзень выкананa толькі на 48 проц.

Спажыўкаапэрацыя выконваючы адзін з важнейшых вучасткаў пляну мабілізацыі сродкаў па лініі паянакапленьняў, авансавых укладаў, прасоўваньня тавараў да спажыўца і г. д. ў большасьці раёнаў БССР зусім дрэнна выконвае фінансавыя пляны.

Напрыклад Любаньскі райсаюз замест ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду аб мабілізацыі сродкаў насельніцтва, на практыцы праводзіў праву апартунізм, які прывёў да ганебнага прарыву ў выкананьні фінпляну. Ён на сёньняшні дзень мае недабору толькі па адных паявых узносах 74.000 руб., запазычанасьць па якіх падае ў большасьці сваёй на заможную частку насельніцтва. Гэта атрымалася толькі таму, што кіраўнікі Любаньскага райфа стаялі ў баку ад справы выкананьня фінпляну ў сыстэме спажывецкай каапэрацыі, ня ўзьдзейнічалі на тавараправодзячую сетку, ня былі штурхачамі паскоранага тавараабароту і пасьленьня мясцовых загатовак.

Арганізацыйная работа ў радзе райфа недапушчальна адстае ў пазыковай кампаніі. Касавыя паступленьні па пазыцы «Трэцяга рашаючага году» па БССР рэзка адстаюць ад плянавых заданьняў. Плян на 1-га верасьня выкананы ня больш як на 30-32 проц. Пры пазуранным фінансава-крэдытнай сыстэмы, паасобныя арганізацыі зусім «забылі» ўнесьці ўтрыманыя грошы ў банк.

Дрэнна таксама абстаіць справа і з афармленьнем падпіскі. Побач з затрыманьнем пазыковых грошай і з афармленьнем падпіскі, неабходна пасіліць тэмпы хутчэйшага сканчэньня розьніцы пазык. сярод аднаасобніка сэктару. ...ёскі.

Два тыдні засталося да канца 3-га кварталу. Гэтыя дні павінны быць затурмавымі днямі ў выкананьні фінпляну. Трэба рашуча ўдарыць па правай практыцы, па «лявацкіх» заскоках, якія зрываюць выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Фінплян—упаўне рэальны. Ня яго выкананьне трэба безадкладна мабілізаваць шырокія масы рабочых, калгаснікаў, беднякоў і серадняковў—гэтага патрабуе народная гаспадарка савецкай краіны.

Фабрыкі чакаюць лёну

Гнаць уверх крывую апрацоўкі лёну

29,7% лёну не абмалочана

Ударна ўбраць апошнія 11 тысяч га

36,7% лёну не разаслана

Вопытам лепшых

узброіць адстаючыя калгасы

Полацак. (Ад нашага спэцкора). Ня гледзячы на тое, што 5-га верасьня павінна была быць скончана поўнасьцю ўборка лёну, плян перабленьня на 3-га верасьня выкананы ледзь на 57,9 проц.

Некаторыя калгасы паказалі бальшавіцкія тэмпы работы. Калгас «Бальшавіцкі Заклік», Мала-Сітнянскага сельсавету, на 2-га верасьня ўбраў 85 пр. усяго ўраджаю. Калгас імя Сталіна ўборку і апрацоўку лёну закончыў на 80 проц.

Калгас «Іскра Рэвалюцыі» добра справіўся з уборкай і першапачатковай апрацоўкай лёну. Да 25-га жніўня была закончана ўборка лёну і ачэсваньне галовак.

Але разам з тым ёсьць калгасы, якія злачынна зрываюць уборку лёну. У калгасе «5-ці годка ў 4-ы гады» выцераблены лён ляжыць і гніе. Да абмалоту яго не прыступаюць. У калгасе «Новы Шлях», Бабыніцкага сельсавету, уборку лёну амаль не пачыналі. У калгасе імя Дзяржынскага, Кушлікоўскага сельсавету, ня ўбралі на ват і паловы лёну.

Я. Зорны.

Канопліі чакаюць уборкі

1/3 пласконі прапала марна

Уборка лёну па Горацкім раёне праходзіць вельмі марудна. Райкалгасаюз, Райза і МТС не зьвярнулі належнай увагі на ўборку і першапачатковую апрацоўку яго. Зусім слаба праводзіцца расьціл і мочка лёну.

Адстае таксама ўборка пласконі. З 935 га канапель выбрана пласконі толькі 635 га, што складае 70 проц. Такім чынам, 30 проц. пласконі зусім прападзе.

Трэба ўжыць рашучыя захады, каб паскорыць уборку лёну, і канапель.

А. Шаўцоў.

Школьнікі дапамагаюць калгасу «Чырвоны Маяк» убіраць лён.

Суботнікі школьнікаў

на ільняных палёх

Бягомльскі раён значна астаў па ўборцы лёну. Рад школ арганізуюць суботнікі па ліквідацыі прарыву.

6-га верасьня Сабалёўская і Мсьціслаская школы наладзілі суботнік у калгасах імя Вароўскага і «Беларусь». У калгасе імя Вароўскага было выцераблена паўтара гектару лёну сіламі адных вучняў.

Брыгада газэты «Сав. Бел.»:
Зьміцер, Волька, Макарэвіч.

* * *

Не гледзячы на тое, што калгас «Бальшавік» Мала-Старасельскага сельсавету, Талачынскага раёну, засеяў усяго толькі 38 га лёну, ён з уборкай яшчэ не справіўся. Толькі дзякуючы дапамозе школьнікаў будзе ліквідаваны прарыў па лёнаўборцы.

3-га верасьня вучні Старасельскай сямігодкі арганізавалі суботнік і за адзін дзень выцерабілі 3 з паловай га. Вучні гэтым не абмежаваліся—ў чарговы выходны дзень яны арганізуюць другі суботнік.

Арэшкаў.

Гарадок выканаў плян азімых

ГАРАДОК. 12-IX. (Па тэлеграфе).

Рапарт сакратару ЦК КП(б)—ГЕЮ, Старшыні СНК БССР—ГАЛАДЗЕДУ, Старшыні НКЗ БССР—РАЧЫЦКАМУ.

Плян Наркамзему БССР па засеве азіміны на плошчы 29.000 га па Гарадоцкім раёне на 12-га верасьня цалкам выкананы.

Сяўба з посьпехам працягваецца.

Сакратар РК КП(б)Б АРАШЧУК.
Старшыня РВК САПРЫЦКІ.
Старшыня райза СІМУКОЎ.

Растуць рады пераможцаў

5 калгасаў скончылі абмалот і расьціл

МАГІЛЕЎ (Белта). Добрасьнезіцкая партячэйка і сельсавет па-баявому мабілізавалі калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на ўшчыльненьне тэмпаў уборкі, абмалоту і расьцілу лёну. 3-га верасьня скончана ўборка 102 га лёну.

Адразу ўсе сілы былі накіраваны на абмалот і на расьціл лёну. Калгасы «Чырвоны Партызан», імя Карла Маркса, «Сталінскі Заклік», «За суцэльную калектывізацыю» і «Чырвоная Іскра» закончылі абмалот і расьціл лёну.

Па астатніх калгасах і аднаасобных гаспадарках сельсавету абмалот і расьціл лёну выкананы на 50 проц.

Вышлі на дапамогу адстаючым

Калгас «Зьвязда», Міхараўскага сельсавету, Полацкага раёну, 1-га верасьня скончыў уборку лёну. У час уборкі працавалі 2 ударныя брыгады жанчын. Паасобныя групы і брыгады паказалі ўзорныя тэмпы работы.

Адна з гэтых брыгад дала падвойную норму выпрацоўкі. Дзякуючы ўдарным тэмпам работы, калгас своечасова скончыў уборку лёну.

На сёньняшні дзень лён замочаны і разасланы.

У сучасны момант калгас пераключыўся на дапамогу адстаючым калгасам па ўборцы лёну і адначасова прыступіў да правядзеньня сяўбы азімінны.

Мікола Яроменка.

Лён цалкам абмалочаны

Калгас «Чырвоная Іскра», Чорназемаўскага сельсавету, Магілеўскага раёну, і калгасы «Суцэльнай Калектывізацыі» і «Сталінскі заклік», Вэндараўскага сельсавету, скончылі ўборку лёну 30 жніўня.

Зараз калгаснікі разгарнулі работу па абмалоту, расьцілу і мочцы лёну. 5-га верасьня скончан абмалот лёну.

Улас. Марскі.

Даем добрае валакно

У калгасе «Чырвоная Полаччына», Лепельскага раёну, ураджай з 80 га лёну вымачаны і гатоў да апрацоўкі. Праца была пабудавана канвеерам: ад начасова праводзілася ўборка лёну, ачосваньне галовак і мочка.

Прыступілі да сушкі лёна. Першая проба дала добрае валакно.

А. Н.

Расьціл і мочка—баявыя вучасткі

Фарсіраваць першапачатковую апрацоўку тэхнічных культур

Клімавічы. (Наш. кар.). Уборка лёну па раёне ў асноўным закончана. Затое амаль зусім не разгарнулася ўборка канапель. Толькі калгас «III Інтэрнацыянал» распачаў гэту працу.

Дрэнна абстаіць справа з першапачатковай апрацоўкай тэхнічных культур. Ня гледзячы на тое, што пабудована машына-трапальнага пункту, павінна была быць ужо скончна, райкаапсаюз у гэтай галіне нічога ня зрабіў.

Бюро РК, рашуча адсудзіўшы апартуністычную недаацэнку важнасьці своечасовай уборкі тэхнічных культур, дало жорсткую дырэктыву сельпартакомам, парт'ячэйкам, сельсаветам і калгаснай сыстэме тэрмінова скончыць уборку і абмалот лёну і канапель не чакаючы поўнага заканчэньня малацьбы, трэба адначасова распачаць расьцілку лёну і скончыць гэту работу не пазьней 10 верасьня. Аначасова неабходна падрыхтаваць дастатковую колькасьць ям.

Разасланы брыгады раённага партактыву і камсамолу па ўсіх сельсаветах, створаны спэцыяльныя жаночыя брыгады, шырока разгорнута арганізацыйна-масавая работа як у калгасах, так і сярод аднаасобнікаў: Дадзена яскравая дырэктыва па лініі спажыўкаапэрацыі аб вылучэньні прэміраваных фондаў (прамтаварамі і інш.), у кожным калгасе і ў кожным сельсавеце вылучаны адказныя за своечасовую і акуратную ўборку і апрацоўку тэхнічных культур работнікі.

В. Бальзоўскі.

Зьлёт лёнаводных калгасаў

ГАРАДОК. (Ад нашага спэцкора). 12-га верасьня адкрылася міжраённая нарада прадстаўнікоў калгасаў 5 лёнаводных раёнаў: Бешанковіцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Мсьціслаўскага і Расонскага.

На канфэрэнцыю прыбыло 80 дэлегатаў.

Парадак дня канфэрэнцыі наступны: 1. выкананьне плянаў арганізацыі і камплектаваньня жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых фэрмаў і здачы таварнай прадукцыі—даклад тав. Міцькова.

2. Апрацоўка і здача лёнаводнай прадукцыі.

Зьлёт заслухаў даклад тав. Міцькова. Пачаліся спрэчкі. Палеес.

Ваенна-палявымі судамі, крывавымі расправамі над палітзьняволенымі

польскі фашызм імкнецца прыдушыць хвалю рэвалюцыйнага руху

Масавыя арышты па ўсёй краіне ня спыняюцца

Польская дэфэнзыва фабрыкуе ваенна-палявы працэс над левымі літаратарамі

ВАРШАВА, 13-IX. Польскі друк перапоўнен паведамленьнямі і рознымі сэнсацыямі аб арышце групы левых літаратараў у Варшаве. Газэты адна перад другой друкуюць усё новыя і новыя «падрабязнасьці» арышту Гэмпэля, Бранеўскага, Хавата і інш.

«Газэта Польска» паведамляе, што справа арыштаванай групы левых літаратараў аддана для вядзеньня сьледзтва віцэ-пракуратару па справе шпіянажу Бацярэльлему.

МАСАВЫЯ БАНКРОЦТВЫ

Новыя тысячы рабочых выкідваюцца на брук

ВАРШАВА, 13. Сацыял-фашысцкі «Работнік» паведамляе, што пасьля банкроцтва гуты «Ляура» ў Семянавіцах (Гурны Шлёнск) у хуткім часе зачыняецца гута «Фіцынус». Такім чынам толькі ў Семянавіцах колькасьць беспрацоўных павялічыцца на 6 тысяч.

У гэтым-жа нумары «Работнік» паведамляе, што ад рабочых у міністэрства працы прыбыла дэлегацыя з просьбаю, каб адтэрмінаваць зачынень не вялікай дзяржаўнай гуты срэбра ў Стрыбніцы. Аднак, ня гледзячы на абяцаньні ў Варшаве гута ліквідуецца. Такім чынам яшчэ некалькі тысяч заставецца бяз працы і бяз хлеба. (Уласн. інф.).

Арышты за камуністычную дзейнасьць у войску

ВАРШАВА, 13. «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» паведамляе: «Органы Корпусу Аховы Пагранічча арыштавалі ў некалькіх пагранічных вёсках Дзісьненскага, Віленскага і Маладычанскага паветаў некалькі выратоўцаў, якія вялі камуністычную агітацыю сярод войска. Пры арыштаваных знойдзена шмат лістовак прызываючых салдат да непаслушэнства».

Ня гледзячы на ўвядзеньне ваенна-палявых судоў, ня гледзячы на крывавыя расправы польскіх фашыстаў над палітзьняволенымі рэволюцыйны рух у Польшчы з кожным днём узмацняецца. Польскія газэты з дня ў дзень перапоўнены падобнымі паведамленьнямі аб арыштах западазроных у камуністычнай дзейнасьці. На месца арыштаваных, на месца забітых у вастрогах становяцца новыя сілы барацьбітоў-рэвалюцыянэраў. Тэрорам польскім фашыстам не спыніць рэвалюцыйнай хвалі.

Абвастрэньне польска-нямецкіх узаемаадносін

ВАРШАВА, 11-IX. (Тасс). Уся польская ўрадавая прэса на чале з «Газэтай Польскай» пачала новую антынямецкую кампанію, у сувязі з пытаньнем аб нацыянальных меншасьцях. «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» друкуе дакументы, уяўляючыя сабой нібы сапраўдную перапіску нямецкага міністэрства замежных спраў з нямецкім консулам у Кракаве Клеманам, якая сьведчыць аб тым, што нямецкае міністэрства замежных спраў і камандваньне рэйхсвэра падтрымліваюць украінскую вайсковую арганізацыю ў Польшчы.

БЭРЛІН, 11-IX. (Тасс). Агенцтва Вольфа паведамляе: «У польскім друку за апошнія дні зьмешчаны паведамленьні аб афіцыйнай дзейнасьці нямецкіх органаў на Заходняй Украіне. Гэтыя паведамленьні аб фактах, якія нібы мелі месца ў 1925-26 г., скарыстоўваюцца для таго, каб сканцэнтраваць сувязь з падзеямі на Заходняй Украіне, якія з прычыны прыгнечаньня украінскай меншасьці ў апошні час усё больш займаюць грамадзкую думку ўсяго сьвету. У польскім друку не застанаўляюцца нават перад тым, каб прыпісаць «нямецкім махінацыям» таксама і забойства Галоўка. Пры ўсіх на добных сьцьвярджэньнях гутарка ідзе, як гэта агенцтва Вольфа даведалася з верагодных крыніц, аб пэўных тэндэнцыёзных паведамленьнях, якія заслугоўваюць самай рэзкай ганьбы.

Забастоўка панчошнікаў Лодзі працягваецца

ВАРШАВА. Рабочыя панчошнай прамысловасьці ў Лодзі працягваюць забастоўку. Настрой вельмі стойкі. Спробы пэнэсэўцаў схіліць рабочых да арбітражу пакуль не далі вынікаў.

Гішпанія ў агні рэвалюцыйнай барацьбы

МАДРЫД. 12-IX. Усё ўзрастаючая нянавісьць народных мас да манархістаў і клерыкалаў выліваецца ў моцную барацьбу супроць палітычных выступленьняў гэтых партый.

У Більбао ўчора адбылася сутычка паміж групамі маладых нацыяналістаў—баскаў і рэспубліканцамі, у час якой адзін забіты і 2 цяжка паранены.

У Мадрыдзе ўчора адбылася арганізаваная беспрацоўнымі дэманстрацыя пратэсту супроць дзеяньняў ураду, якая была разагнана паліцыяй.

У Фігуэрас, правінцыі Герона, пачалася ўсеагульная забастоўка пратэсту супроць дзеяньняў паліцыі ў час аднае сутычкі.

У Хэрэндоце і Гуэка правінцыі Толедо рабочыя абвясьцілі забастоўку, у час якой мелі месца выступленьні супроць земляўладальнікаў.

У Сэвільі салдаты артылерыйскага палка ўзбунтаваліся пратэстуючы супроць дрэнных харчоў.

За падаткі

У баярска-фашысцкай Румыніі ўрадавыя чыноўнікі за нядоімкі па падаткам забіраюць усю маемасьць, дзьверы, вокны, а ў некаторых выпадках «канфіскуюць» нават і дзяцей.

(З газэт).



Супроць рабаўнічага „рэжыму эканоміі" ураду Англіі

шматтысячныя дэманстрацыі пратэсту па ўсёй краіне

ЛЁНДАН, 12-IX. Супраціўленьне рабочых урадавым мерапрыемствам па правядзеньню эканоміі набывае шырокія размеры. У Хенлі (графства Стэмфордшыр) 1000 рабочых прайшлі па вуліцах гарадоў. На буйнай масавай дэманстрацыі была аднагалосна прынята рэзалюцыя з асуджэньнем «нацыянальнага» ўраду і фальшывай апазіцыі лебарысцкай партыі, якая аказвае дапамогу «нацыянальнаму» ўраду, каб задушыць барацьбу рабочых па-за сьценамі парляманту. У Сільвэрдаве 3 тысячы рабочых наладзілі дэманстрацыю, на чале якой ішлі рэвалюцыйныя работніцы з чырвонымі сьцягамі. Падобнае-ж адбылося ў Бэрнлі, Эдынбургу, Бэркенхэндзе і Барроў.

У Гланморгане 600 гарнякоў, зьявіўшыся на мітынг, скліканы мясцовым аддзелам паўднёва-ўэльскай рэфармісцкай фэдэрацыі гарнякоў у шахце Рок (Нортумбэрленд), даручылі выканкому склікаць мітынгі сумесна з іншымі пралетарскімі арганізацыямі для падрыхтоўкі масавай барацьбы супроць мерапрыемстваў «нацыянальнага» ўраду. Заўтра ў Сярэдняй Рондзе (Паўднёвы Уэльс) акруговы камітэт дзеяньня склікае канфэрэнцыю ўсіх рабочых арганізацый акругі з аналогічнай мэтай.

Згодна паступаючых паведамленьняў з месц, з часу прыходу да ўлады «нацыянальнага» ўраду кампартыя завербавала больш лік членаў, чым за любы аналогічны пэрыяд з 1926 году. За апошнія некалькі тыдняў колькасьць лёнданскай арганізацыі камсамолу павялічылася ў два разы.

Учора ў Лёндане адбыліся дзьве вялікія дэманстрацыі настаўнікаў супроць зьніжэньня зарплаты. Адна дэманстрацыя, з лікам удзельнікаў да 5 тысяч, прайшла праз цэнтральную частку гораду і наладзіла мітынг у залі Кінгсуэйхолл. Больш за палову дэманстрантаў, для якіх не хапіла месца ў залі, наладзілі паралельны мітынг на вуліцы. Ня гледзячы на энэргічныя дзеяньні паліцыі вялікі натоўп абкружыў дэманстрантаў, з прычыны чаго трамвайны і аўтабусны рух быў паралізаваны на працягу некалькіх гадзін. Другая аналогічная дэманстрацыя ад былася ў Вэстмінстэры. У гэтай дэманстрацыі ўдзельнічала 6 тысяч чалавек. Пад уплывам прафсаюзных бюракратаў, абодвы мітынгі прынялі рэзалюцыю дамагацца аднаўленьня ранейшай зарплаты «ўсімі легальнымі сродкамі».

ЛЁНДАН, 11-IX. (Тасс). Паводле паведамленьня агенцтва Рэйтэр, Макдональд, баронячы ў другім зачытаньні ўнесены ўрадам законапраект аб «эканоміі» (які прадастаўляе права праводзіць меры «эканоміі» шляхам загадаў ураду, выданых па ўказаньню тайнай рады) заявіў, што законапраект зьяўляецца надзвычайнай мерай, выкліканай дзяржаўнай неабходнасьцю.

Паводле слоў Макданальда, адно толькі збалянсаваньне бюджэту ня зьнішчае прычын, абумаўляючых атмасфэру няўстойлівасьці. Агульнае фінансавае становішча павінна быць аздароўлена настолькі, каб усякі, хто вядзе справы з Вялікабрытаніяй (асабліва гэта датычыцца пазык) быў здаволен. Макданальд зазначыў далей, што плян канвэрсіі (зьмена ўмоў пазыкі) будзе выдан пры першай магчымасьці.

Прэм'ер баранёй затым скарачэньне дапамогі беспрацоўным заявіўшы, што «абязцэньваньне валюты мела-б больш катастрафічныя вынікі, чым зьніжэньне дапамогі».

Вялікае абурэньне сярод апазіцыі выклікала месца прамовы Макданальда, прысьвечанае апісаньню абгаварэньня лейбарысцкім урадам мер «эканоміі».

Лейбарыст Клайнс (былы міністр унутраных спраў) пратэставаў супроць «сталай прапаганды супроць лейбарысцкага ўраду». Клайнс сьцьвярджаў, што калі-б лейбарысцкаму ўраду была прадастаўлена свабода дзеяньняў, ёнбы змог збалянсаваць бюджэт такім чынам, што гэта здаволіла-б усіх.

Румынія ўзбройваецца

—Супроць каго?—Супроць Краіны Саветаў

ВЕНА. Паводле паведамленьня Бухарэсцкай газэты «Адэвэруль» румынскі вайсковы міністр падрыхтоўвае законапраект, які прадугледжвае карэнную рэарганізацыю румынскай армії. Мяркуецца правесьці «рацыянальную рэарганізацыю армейскіх запасаў».

Законапраект прадугледжвае далей канкрэтны плян ваеннай падрыхтоўкі ўсіх грамадзян, уключаючы і дапрызыўнікаў. Асаблівая ўвага зварочваецца стварэньню новых школ для ваеннай падрыхтоўкі новых тэхнічных часьцей і рацыяналізацыі амуніцыі. Мяркуецца таксама пабудова новых ваенных заводаў, аэрадромаў і казарм. Максымальны ўзрост для запаснай вайсковай службы павялічваецца з 42 год да 50.

Сустрэць манэўры СПА падрыхтаванымі

Ліквідуючы прарыў, узмацняем абарону краіны

Фабрыка «Беларуска» разгортвае работу па падрыхтоўцы да манэўраў СПА сярод шырокіх колаў рабочых.

Праведзены атульныя партыйныя і камсамольскія сходы. Адбылася нарада камандзнага складу. У цэхах вылучаны агітатары, якія пачалі работу. З учарайшняга дня праводзяцца сходы ў цэхах, якія праходзяць пры вялікай актыўнасьці рабочых.

Цэхавыя насьценгазэты пачалі асьвятляць пытаньні манэўраў СПА і абароны краіны наогул.

Пост СПА заўчора выпусьціў першы нумар сваёй насьценгазэты. Яна будзе выходзіць праз дзень, на другі дзень пасьля чарговых заняткаў каманды. Газэта цесна ўвязвае пытаньне манэўраў з выкананьнем прамфінпляну.

У гузікавым цэху фабрыкі маецца прарыў у выкананьні прамфінпляну. Насьценгазэта паста зараз высоўвае пытаньне аб стварэньні манэўраў на вытворчасьці з мэтай ліквідацыі гэтых прарываў.

Быць гатовымі да праверкі

Заўтра ў ноч з 16 на 17 верасьня будзе праведзена пробная сьветамаскіроўка гораду Менску.

З 11 гадзін увечары электрычны сьвет у горадзе будзе выключаны.

Усе ўстановы і прыватныя грамадзяне павінны будуць альбо не зажыгаць сьвету, альбо завешваць вокны сьветанепраніцаемымі шторамі.

Пробная сьветамаскіроўка гораду—яшчэ не манэўры: гэта толькі праверка падрыхтаванасьці гораду да манэўраў, праверка падрыхтаванасьці пастоў і камандаў СПА.

Заняткі з камандай СПА вядуцца праз дзень. У іх прымаюць удзел шырокія масы рабочых. На адбыўшыхся 4-х занятках да 12-га верасьня (уключаючы усіх рабочых) яўка была—80 проц. 12-га верасьня зьявілася ўжо больш чым 96 проц. Гэта сьведчыць, аб тым, што работа па падрыхтоўцы да манэўраў разгорнута добра і вядзецца ў належным напрамку.

Пост «С. Б.». Рэўтовіч.

«Беларуска», як быццам добра ўзялася за работу абароны і ў прыватнасьці за падрыхтоўку да манэўраў СПА.

Але актыўнасьць рабочых, якая ўсё больш расьце, трэба замацаваць і накіраваць на рэйкі сталай ударнай работы, па ўзмацненьні абароны краіны шляхам ліквідацыі прарываў, выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну, арганізацыі шырокай вайсковай вучобы і пашырэньня радоў Асавіяхіму.

Партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі, а таксама і адміністрацыя фабрыкі не павінны застанаўляцца на дасягнутых посьпехах. Трэба работу пашырыць і ўзмацніць, пераключыўшы на сталыя рэйкі.

Рэйд ударных брыгад газэт „Савецкая Беларусь“, „ЗКП“, радыё-газэт „Калгасны Заклік“ і „За бальшавіцкія тэмпы“

РАДЫЕАГЛЯД ПЕРАТВАРЫЦЬ У МАСАВУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ КАМПАНІЮ

Мабілізаваць шырачэзныя масы працоўных на ліквідацыю прарываў у радыёбудаўніцтве, на рэканструкцыю радыёвяшчаньня, на барацьбу за аўладаньне радыётэхнікай, за ператварэньне радыё ў магутны сродак сацбудаўніцтва

„Мы напісалі загад № 145 і хопіць“...

Кантора забесьпячэньня Беларускага Кіраўніцтва Сувязі забясьпечвае радыё-вузлы і радыё-партаўдыторыі неабходнымі матар'ялмі і апаратурай. Ад працы канторы і забесьпячэньня залежаць тэмпы радыёфікацыі БССР.

Кантора забесьпячэньня Беларускага Кіраўніцтва Сувязі яшчэ не перабудавала сваю работу ў адпаведнасьці з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва. Яна працягвае працаваць па старынцы,—сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў работе зусім ня ўжываюцца. Кіраўніцтва канторы, відаць, лічыць, што гэтыя мэтады працы павінны мець месца толькі на прадпрыемствах.

У выніку заказы, атрыманыя канторай забясьпячэньня ад Белрадыёцэнтру, ня выконваюцца, апаратура на будаўніцтва радыё-вузлоў і райпарт-радыё-аўдыторый не дастаўляецца. Ёсьць выпадкі, што апаратуру накіроўваюць у тыя месцы, дзе яна зусім не патрэбна.

Кантора забесьпячэньня не зварочвае ўвагі на якасьць пасыланай апаратуры і няўважліва адносіцца да гэтай справы. Ёсьць выпадкі калі да дасланай радыё-апаратуры не хапае некаторых частак і яна на мясцох не выкарыстоўваецца, у той час калі гэтыя часткі знаходзяцца ў канторы забесьпячэньня.

Адміністрацыя канторы забесьпячэньня ня прыняла захадаў, каб заказы выконваліся своячасова і каб апаратура на мясцох радыё-будаўніцтва атрымлівалася ў тэрмін. На запытань не брыгады, што зроблена канторай забесьпячэньня ў гэтым напрамку, загадчык яе т. Бруякін адказаў: **«Наша справа маленькая, мы паслалі апаратуру тады, калі была магчымасьць, а калі яна паступіла, нас гэта не датычыцца».**

Да двухдэкадніка дапамогі радыё кантора забесьпячэньня зусім не падрыхтавалася. Калі рабочая брыгада запытала загадчыка канторы, што зроблена для правядзеньня двухдэкадніка дапамогі радыё, якая праведзена праца сярод рабочых канторы, дык т. Бруякін адказаў: **«Двухдэкаднік дапамогі радыё нас не датычыцца, гэта справа Белрадыёцэнтру, хай Шукевіч праводзіць двухдэкаднік дапамогі радыё, наша справа па магчымасьці выконваць сваю працу, вось і ўсё, навошта нам рыхтавацца да двухдэкадніка дапамогі радыё, мы нічога не рабілі і рабіць ня будзем».**

Ня лепш абстаіць справа і ў плянавым сэктары Беларускага Кіраўніцтва Сувязі. Загадчык сэктару т. **Абрамчык** толькі ад брыгады даведаўся аб двухдэкадніку дапамогі радыё. Урэшце, у плянавым сэктары брыгадзе заявілі: **«ніякай падрыхтоўчай работы мы не вялі і не патрэбна яе праводзіць, а вось напісаны загад аб правядзеньні двухдэкадніка за № 145, якая больш вам патрэбна падрыхтоўчая работа».**

Двухдэкаднік—важную палітычную кампанію, чыноўнікі думаюць правесьці бюракратычным загадам, яны выхалашчваюць палітычную сутнасьць правядзімай кампаніі дапамогі радыё.

Прарывы, якія маюць месца ў рабоце канторы забесьпячэньня і плянавага сэктару, павінны зацікавіць партка лектыў Беларускага Кіраўніцтва Сувязі, ён павінен зрабіць належныя вывады і прыняць меры да іх ліквідацыі.

Брыгада **Саўчанка, Ждановіч, Каліцкі.**

Будаўнікі Менску не абслугоўваюцца радыёвяшчаньнем

Аб правядзеньні двухдэкадніка дапамогі радыё на пабудове Дому Ураду нічога ня ведаюць. Пытаньне па правядзеньні двухдэкадніка на рабочых сходах не абгаворвалася. З радыёфікацыяй будаўніцтва справа абстаіць дрэнна; ёсьць некалькі рэпрадуктараў, а іх працуюць толькі два ў стлаоўцы. Складзены каштарыс радыёфікацыі, вызначана 250 руб., саюз будаўнікоў адпусьціў на гэту справу толькі 130 руб., але... Да гэтага часу і каштарыс і сродкі ляжаць у саюзе.

На запытаньне брыгады, сакратар камсамольскай ячэйкі тав. **Мазэр** адказаў: **«Няма часу цяпер займацца радыёфікацыяй, у нас прарывы і нам не да радыё».** Гэткія адносіны з боку ўсяго трыкутніка пабудовы Дому Ураду. Думка выказаная тав. Мазэр сьведчыць аб недаацэнцы радыё аб яго апартуністычных адносінах да гэтай справы.

Патрэбна рашуча ўдарыць па гэткіх апартуністычных адносінах да справы радыёфікацыі і радыёвяшчаньня. Рабочкому і партячэйцы будаўніцтва патрэбна зараз-жа разгарнуць работу па правядзеньні двухдэкадніка дапамогі радыё і неадкладна заняцца радыёфікацыяй пабудовы.

Брыгада: **Харко, Русак, Патоцкі.**

На заводзе імя Варашылава трэба пабудаваць радыё-вузел

Заўком і парткалектыў заводу імя «Варашылава» недаацанілі значэньня радыё-фікацыі заводу. Да апошняга часу на заводзе было ўстаноўлена 5 рэпрадуктараў. Зараз гэтыя рэпрадуктары па невядомых прычынах зьняты. Такім чынам, **у сучасны момант на заводзе поўнае радыё-маўчаньне.**

На запытаньне брыгады, чаму зьняты рэпрадуктар у мэханічным цэху, рабочы гэтага цэху адказаў, што так захацеў заўком. Масавай работы па арганізацыі радыё на заводзе не вядзецца. Няма адказнай асобы за арганізацыю радыё-справы на заводзе. Ячэйкі таварыства прыхільнікаў радыё таксама няма. Заводзкая шматтыражка «Чырвоны Молат» ня цікавіцца пытаньнямі папулярызацыі радыё сярод рабочых заводу.

Перад парткалектывам і заўкомам заводу стаіць неадкладная задача—у час двухдэкадніка разгарнуць радыё-фікацыю заводу.

Для пасьпяховага прасоўваньня радыё ў масы і мабілізацыі рабочых праз радыё на выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на заводзе ёсьць спрыяючыя ўмовы. Значная частка рабочых заводу займаецца радыёаматарствам і жадае ўдзельнічаць у арганізацыі і добрай пастаноўцы радыё-вяшчаньня на заводзе.

Зараз-жа патрэбна арганізаваць на заводзе ячэйкі таварыства прыхільнікаў радыё і забясьпечыць іх бальшавіцкім кіраўніцтвам. Заводзкая шматтыражка «Чырвоны Молат» павінна змагацца за няўхільнае правядзеньне ў жыцьцё пастановы ЦК КП(б)Б аб двухдэкадніку агляду і дапамогі радыё.

Белрадыёцэнтру патрэбна тэрмінова прыняць захады да пабудовы на заводзе імя «Варашылава» радыё-вузла і забясьпечыць сталым тэхнічным кіраўніцтвам работу апошняга.

Брыгада: **Ігнатовіч, В. Лапкоўскі, Гурэвіч.**

Сакратар парткалектыву службы цягі т. Барысевіч

„ня мае часу, каб чытаць пастановы ЦК партыі“

На Менскім чыгуначным вузьле МББ больш як паўгода ўстаноўлен трансьляцыйны вузел, які да гэтага часу абслугоўвае толькі адзін клюб «Ільліча».

Абвешчаны двухдэкаднік агляду дапамогі радыё ня даў штуршка партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыям чыгуначнага вузла, якія яшчэ да гэтага часу нічога не зрабілі ў справе пасьпяховага правядзеньня двухдэкадніка.

Калі брыгада прыйшла ў парткалектыў службы цягі для арганізацыі ячэек таварыства прыхільнікаў радыё і дапамогі ў арганізацыі радыёвяшчаньня, дык сакратар парткалектыву службы цягі т. **Барысевіч** сустрэў брыгаду з вялікім шумам, заявіўшы: **«рабкоры і брыгады так ужо мне надаелі, што ад іх адбою няма, я стараюся, каб як найменш да нас хадзілі брыгады».**

Брыгада задала пытаньне т. Барысевічу—ці чытаў ён пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб двухдэкадніку дапамогі радыё, ён адказаў, што ў **яго часу няма чытаць усе пастановы ЦК, а аб радыё тым больш у мяне няма часу».**

Вось самыя яскравыя апартуністычныя адносіны да выкананьня дырэктыў партыі і ўдарнага рабселькораўскага руху. З такога адказу і такіх адносін да пастаноў ЦК адпаведныя органы павінны зрабіць належныя вывады.

Ня гледзячы на рад труднасьцяй, з якімі сустрэлася брыгада, усё-ж удалося правесьці сход рабочых у дэпо і арганізаваць ячэйку ТПР, завербаваць лепшых рабкораў для цэнтральных радыёгазэт.

Парткалектыў службы цягі павінен выканаць дырэктывы партыі і стаць на чале кіраўніцтва рабочай масы па перабудове радыёвяшчаньня і прасоўваньня радыё ў масы.

Неабходна адразу-ж аднавіць работу трансьляцыйнага вузла, паставіўшы сабе задачай радыёфікаваць поўнасьцю чыгуначны вузел і рабочыя кватэры.

Шматтыражка «Чырвоны чыгуначнік» павінна па бальшавіцку ўзяцца за арганізацыю грамадзкасьці для прасоўваньня радыё ў масы, стварыўшы ў кожным прадпрыемстве чыгуначнага вузла ячэйкі ТПР.

Радыёцэнтр павінен дапамагчы ў арганізацыі радыёфікацыі чыгуначнага вузла, прадаставіўшы ўсе неабходныя матар'ялы для абсталяваньня.

Брыгада ўстанавіла, што рабочыя чыгуначнікі зацікаўлены радыёвяшчаньнем, але яны патрабуюць штодзённага кіраўніцтва і дапамогі ў гэтай справе. Рабочыя дэпо абяцалі дапамогу правядзеньню двухдэкадніка дапамогі радыё.

Разгортваньне двухдэкадніка павінна праводзіцца на чыгуначным вузьле, як масава-палітычная кампанія за аўладаньне тэхнікай радыё шырокімі коламі рабочых, за рэканструкцыю радыёвяшчаньня, максымальнае пашырэньне радыёкропак і ператварэньне радыё ў магутнейшы сродак у барацьбе за выкананьне прамфінпляну і мабілізацыю грамадзкасьці на барацьбу за генэральную лінію партыі.

Брыгада: **Гольдзін, Сімкіна, Альдшулер, Раманаў.**

„Гэта ня наша справа“—так разважаюць у ЦП саюзу саўгаспрабочых

На запытаньне нашай брыгады, намесьнік заг. культсэктару ЦП саюзу саўгасных рабочых т. **Шуша** адказаў: **«Няхай займаюцца праверкай радыёвяшчаньня і двухдэкадніком бюракраты радыёцэнтру. Гэта ня наша справа».**

Па вестках, атрыманых у ЦП саюзу ёсьць 39 саўгасаў, у якіх ёсьць 46 радыёўстановак з гучнагаварыцелямі. На сёньняшні дзень на 75 проц. гэтыя ўстаноўкі маўчаць. Т. Шуша тлумачыць гэта тым, што няма належнай радыёапаратуры, няма кіраўніцтва, пануе абязьлічка на радыёфронце.

Па пляну саюз меркаваў адраманта ваць усе 46 установак з гучнагаварыцелямі, 12 дэтэктарных прыёмнікаў, па ставіць 8 новых прыёмнікаў з гучнагаварыцелямі і 18 радыёперасовак. Але, дзякуючы бюракратычным адносінам працаўнікоў ЦП саюзу саўгасных рабочых, гэтыя меркаваньні засталіся на паперы,—гучнагаварыцелі маўчаць і нічога ня робіцца па скарыстаньні радыё для разгортваньня культпалітасьветработы сярод рабочых.

ЦП саюзу сельска-гаспадарчых рабочых павінна неадкладна прыняць меры да наладжваньня радыёўстановак у саўгасах. Трэба за час двухдэкадніка адрамантаваць сапсаваныя ўстаноўкі і ўстанавіць максымум новых. Патрэбна мабілізаваць масы саўгасных рабочых на дапамогу радыёсправе, згрупаваць іх вакол работы радыёвяшчаньня, вакол работы радыёгазэт.

Брыгада **Альховік, Балуценка.**

На менскіх цагельных з водах № 1 і 3

радыё—забыты вучастак

Аб двухдэкадніку агляду і дапамогі радыё першы раз чуем,—так заявілі старшыня заўкому Менскага цагельнага заводу № 1 тав. **Бадулевіч** і сакратар партячэйкі тав. **Пашсман.**

На заводзе няма ніводнай радыёўстаноўкі. У 1930 г. быў адзін прыёмнік, але з тэй прычыны, што ня было адказнага таварыша за радыё-ўстаноўку, прыёмнік паламалі.

На заводзе няма ні гуртка таварыства прыхільнікаў радыё, ні літаратуры па пытаньнях радыё. **Рабочыя заводу заявілі, што яны вельмі зацікаўлены справай радыё,** але партарганізацыя і заўком да гэтага часу нічога не рабілі ў гэтай галіне. Толькі тады, калі на завод прыбыла ўдарная брыгада па абсьледваньні работы па правядзеньні двухдэкадніка дапамогі ардыё, адміністрацыя і ў партячэйцы заводу заявілі, што калі будзе дана дапамога з тэхнічнага боку, дык будуць адпушчаны сродкі на радыёфікацыю заводу.

Таксама нічога ня зроблена па радыёфікацыі і на цагельным заводзе № 3. Тут таксама ніхто ня чуў аб двухдэкадніку дапамогі радыё. На заводзе ёсьць адзін радыё-прыёмнік, як ўстаноўлены яшчэ ў 1928 годзе, але зараз ён маўчыць. Абарвана антэна і ніхто ня цікавіцца тым, каб яе наладзіць.

Заўкомам і парткалектывам цагельных заводаў № 1 і № 3 патрэбна зараз-жа разгарнуць работу па радыёфікацыі заводаў. У час двухдэкадніка дапамогі радыё патрэбна шырока паесьці растлумачальную работу сярод рабочых аб значэньні радыё-вяшчаньня наогул і радыё-друку ў прыватнасьці, і мабілізаваць рабочыя масы на дапамогу радыё.

Брыгада **Грымблат і Кашэльскі.**

Не дапусьціць зрыву зімовай партвучобы

У Рудзенскай парт'ячэйцы Пухавіцкага раёну пастанова ЦК КП(б)Б аб правядзеньні «дню партыйнай вучобы» і аб сетцы партасьветы на 1931-32 навучальны год зусім не распрацавана.

Трэба неадкладна разгарнуць шырокую работу па камплектаваньні сеткі партасьветы, падрыхтаваўшы неабходныя кадры і падручнікі. Інакш зімовая вучоба будзе сарвана.

Рыг. Асака.

ДАЛОУ З КАЛГАСНАГА ХЛЕБА

ўсіх аматараў пажывіцца за кошт чужой працы

Кулак агітуе супроць разьмеркав ньня калгасных даходаў па працы. Мацней удар па кулацкіх спробах развал ць калгасную вытворчасьць

Дабіць кулацкую ўраўнілаўку!

Пастанову НКЗ і Калгасцэнтру давесьці да кожна а калгасьніка

АСІПАВІЧЫ. (Белта). Барацьба за ўкараненьне зьдзельшчыны ня стала ў цэнтры ўвагі кожнага калгасу і калгасьніка. Калгасьнікі ня ведаюць, што калгасныя даходы будуць разьмяркоўвацца толькі па працы. Пастанова Калгасцэнтру і Наркамзему аб паралку разьмеркаваньня калгасных даходаў не даведзена да калгасаў і калгасьнікаў, не абмеркавана на калгасных сходах.

Важнасьці гэтай справы не разумее і старшыня райкалгассаюзу. Замест канкрэтнага, апэрацыйнага кіраўніцтва, ён займаецца кіраўніцтвам «наогул». Так, калі да яго зьвярнуўся старшыня калгасу «Новае селішча» з запытаньнем, як разьмеркаваць ураджай, ён даў наступны адказ:

— Разьмяркоўвайце па працаднёх!

Зусім зразумела, што такая агульная дырэктыва ня можа задаволіць калгасьнікаў. Замест гэтай агульнай дырэктывы трэба было падрабязна расказаць ня толькі аб асноўным прынцыпе, але і аб тэхніцы разьмеркаваньня калгасных даходаў.

А ў выніку ўсяго гэтага некаторыя калгасы ажыцьцяўляюць кулацкую ўраўнілаўку. Так, калгас «Чырвоны бераг», Лапіцкага сельсавету, разьмеркаваў раньнюю бульбу па едакох. Калгас «Новая каменка» скошаную з 6 га канюшыну разьмеркаваў па гаспадарках. Калгас «Іскра» разьмеркаваў сена па колькасьці галоў жывёлы ў кожнай гаспадарцы, таму пралезшыя ў калгас заможнікі Бяліка і Бярнікоўскі атрымалі сена больш за ўсіх.

Кулацкую ўраўнілаўку трэба вытравіць з карэньнямі, а тыя, хто праводзіць у жыцьцё гэты кулацкі прынцып разьмеркаваньня, павінны атрымаць па заслугах.

Разбазарваюць калгасны фураж

ДУБРОЎНА. (Наш. кар.) Каля 40 пр. калгасаў Дубровеншчыны карыстаюцца ўраўнілаўкай у разьмеркаваньні даходаў. Сена ў калгасах падзяляецца не па працаднёх, а па колькасьці кароў. «Норма» водпуску сена на карову 60—80 пуд.

Па кулацкаму прынцыпу разьмеркаваньня даходаў, па апартуністычнаму кіраўніцтву калгасаў, па спробах разбазарыць калгасны фураж трэба моцна ўдарыць.

Раздайце калгасьнікам працоўныя кніжкі

У калгасе «Перамога», (Куракаўскі сельсавет), не вядзецца правільнага вучоту працоўнай сілы, вучоту працы кожнага калгасьніка і г. д.

Бываюць выпадкі, што працоўныя дні таго ці іншага калгасьніка ня ўпісваюцца ў агульны табель.

Калгасьнікам ня раздадзены працоўныя кніжкі.

Калгасьнік.

Наладзіць вучот

У цэлым радзе калгасаў Стара-Дароскага раёну адсутнічае кантроль і правільны вучот прыбыткаў і выдаткаў калгаснай маёмасьці.

У калгасе «Новы селянін», Дружлінскага сельсавету, за пяцідзёўку мелася да 500 руб. прыбыткаў грашыма, але запісаў прыбыткаў праўленьне ня вядзе.

Ніякіх грашовых кніг у калгасе няма. Рахункаводзтва ў калгасах яшчэ да гэтага часу не наладжана.

Райкалгассаюз ня даў належных указаньняў сельсаветам і калгасам аб наладжваньні вучоту працы і прыбыткаў у калгасе.

Гром.

Авансы па едакох--удар па калгасу

ГАРАДОК (наш спэцкор). Да гэтуль многія калгасы раёну ігнаруюць зьдзельшчыну. Да гэтых калгасаў трэба аднесьці: калгас імя «Х Ўсебелярускага Зьезду Саветаў», Вярэцкага сельсавету, дзе зьдзельшчына адсутнічае, калгасы «Прагрэс» і «Камсамолец», Віраўлянскага сельсавету, дзе ад зьдзельшчыны адмаўляюцца. У гэтых апошніх калгасах **працоўныя кніжкі ня выданы, пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні ўраджаю не распрацавана. У калгасе «Прагрэс» хлебныя авансы выдаюцца па едаках.** У калгасе «Чырвоная Зорка», Асіповіцкага сельсавету, таксама ажыцьцяўляецца кулацкая ўраўнілаўка. У калгасе «Ленінскі Шлях» вучот працы вядзецца пры дапамозе «палачак».

Добрыя прыклады паказаў калгас імя Молатава, Кабішчанскага с-савету Дзякуючы ўвядзеньню зьдзельшчыны, лён цалкам выцераблен, абмалочан і разасланы. Пачалі здаваць ільносемя. Сяўба жыта скончана. Гэткіх-жа носьпехаў дасягнула камуна «Чырвоны Сьцяг», Селішчанскага сельсавету. У гэтай камуне лепшыя ўдарніцы—Дзергачова, Фядотава Ульяна, Гальчулава Лукер'я, Пятрова Мар'я паказалі ўзорныя прыклады працы, перавыконваючы нормы выпрацоўкі.

Л. Палеес.

У палоне падзёншчыны

У калгасах Заслаўшчыны недапушчальна марудными тэмпамі наладжваецца вучот працы, што ставіць пад пагрозу правільнае разьмеркаваньне калгасных даходаў у гэтым годзе.

Яшчэ да гэтага часу калгас «1-га мая» і «Чырвоны захад» улічваюць работу падзённа. Рад калгасаў, як «Зялёны гай», «Чырвоны будаўнік», «1-га мая» і інш., яўна ігнаруюць справу ўвядзеньня зьдзельшчыны.

Калгасы «Новы быт», «Зьвязда», «Чырвоны калгасьнік» толькі фармальна ўвялі зьдзельшчыну, а па сутнасьці працуюць падзённа.

Да разьмеркаваньня ўраджаю калгасы не падрыхтоўваюцца. Неабходна ў самы кароткі час выканаць дырэктывы партыі і ўраду аб арганізацыі працы ў калгасах, увядзеньні зьдзельшчыны, правільным вучоце працы, ліквідацыі абязьлічкі і г. д.

Мядзьведзяў.

60 калгасаў не пераведзены на зьдзельшчыну

Пухавічы. (Белта). Па ўсіх калгасах Пухавіцкага раёну ўкараненьне зьдзельшчыны прасоўваецца вельмі дрэнна.

З 143 калгасаў на зьдзельшчыну перайшло 83, але і там напалову яна праводзіцца фармальна.

Ні Райкалгассаюз, ні праўленьне калгасаў ня прымаюць патрэбных рашучых крокаў па пераводзе на зьдзельшчыну ўсіх работ.

Абвяшчаем агляд калгаснай жывёлагадоўлі

Праверым арганізацыю працы ў калгасных таварных жывёлагадоўчых фэрмах

Калгасцэнтр СССР з 28-га верасьня па 1-га кастрычніка праводзіць дэкадник агляду калгасных і жывёлагадоўчых таварных фэрмаў.

Задача агляду — мабілізаваць масы калгасьнікаў вакол задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у галіне разьвіцьця калгаснай таварнай жывёлагадоўлі. Агляд павінен праверыць пастаноўку арганізацыі працы ў калгасных таварных жывёлагадоўчых фэрмах і забясьпечанасьць на зіму калгаснай жывёлы кармамі і памяшканьнямі.

Галоўны тормаз у разьвіцьці калгаснай таварнай жывёлагадоўлі—абязьлічка ў даглядзе за жывёлай. У дэкадник агляду абязьлічка павінна быць ліквідавана ва ўсіх жывёлагадоўчых фэрмах. Жывёла і інвэнтар павінны быць замацаваны за пэўнымі калгасьнікамі і калгасьніцамі, якія адказваюць за захаванасьць і добрае ўтрыманьне жывёлы.

Усю работу ў калгасных фэрмах трэба перавесьці на зьдзельную аплату, а колькасьць і якасьць работы павінна вызначацца ў залежнасьці ад колькасьці і якасьці атрымліваемай прадукцыі.

Важнейшай задачай кожнага калгасу зьяўляецца ўцягненьне жанчын-калгасьніц у работу па арганізацыі таварнай жывёлагадоўлі і дагляду за жывёлай. Даярак, скотніц, птушніц і гэтак далей трэба замацаваць на сталай работе. Павінна быць абвешчана барацьба перакідцы калгасьніц з аднэй работы на другую. Для палепшаньня дагляду за жывёлай у дэкаднік агляду неабходна разгарнуць барацьбу за аўладаньне тэхнікай правільнага дагляду за пагалоўем. У кожным калгасе і фэрме трэба выпрацаваць правілы ўтрыманьня жывёлы і ўстанавіць кантроль за выкананьнем гэтых правіл.

У сыстэме мерапрыемстваў па разьвіцьці калгаснай жывёлагадоўлі важнейшае значэньне мае забясьпечаньне жывёлы кармамі на зімовы пэрыяд. Прарывы ў загатоўцы кармоў павінны быць безадкладна ліквідаваны шляхам выканаьня і перавыкананьня плянаў па сілаваньні.

Для лепшай арганізацыі агляду Калгасцэнтр раіць абмеркаваць задачы агляду на агульным сходзе калгасьнікаў і калгасьніц і вызначыць канкрэтны плян правядзеньня агляду ў даным калгасе. Праўленьне калгасу і калгасьнікі павінны вылучыць брыгады па наладжаньні правільнай арганізацыі і вучоту працы, ліквідацыі абязьлічкі, даглядзе за жывёлай; брыгады па праверцы забясьпечанасьці фэрмы кармамі на зімовы пэрыяд і па ліквідацыі прарываў у гэтай справе; па будаўніцтве і ўцяпленьні памяшканьняў для жывёлы і птушкі з тым, каб цалкам былі скарыстаны ўсе мясцовыя будаўнічыя матар'ялы ў рэштку будаўнічага сэзону. У брыгады трэба ўвесьці лепшых калгасьнікаў і калгасьніц-ударніц.

Калгасны друк, калгасныя насьценгазэты і шматтыражкі павінны мабілізаваць увагу ўсёй калгаснай грамадзкасьці на правядзеньне агляду, шырока паведамляць калгасьнікаў аб ходзе агляду і выявіць найбольш адсталыя вучасткі і паказаць узоры ў рабоце фэрмаў.

Агляд павінен выявіць тысячы новых ударнікаў калгаснай жывёлагадоўлі. Для прэміяваньня гэтых ударнікаў вызначаны спэцыяльны прэміяльны фонд.

2. Дарогу дому Кільчэўскага!

І на самай справе надворны выгляд дому Кільчэўскага надзвычайна буднічны. Плоскі дах, доўгая сумная пабудова трохі напамінала таварны вагон... Калі дырэкцыя прапанавала завяць там кватэры ўсе адмовіліся:

— Няхай Кільчэўскі сам жыве ў такім бараку.

Знайшліся дзьве сям'і, якія згадзіліся пасяліцца. Больш верна, вострая патрэба пагнала іх туды.

У Кільчэўскага настрой зьнізіўся. У кожнай рэплікі—не заслужаны дакор. Калегі—інжынэры сустракалі яго ў гэтыя дні з пераўвялічанай ветлівасьцю, з затоенай насьмешкай. Другія з спачуваньнем і жаласьлівасьцю...

Праз два дні калі дом быў афарбаваны, пабудаваны печы, калі пэнзаль дакрануўся падлогі і вокнаў—дом ператварыўся. Учарайшыя «жартаўнікі» замаўчалі. Адзін з гэтых «жартаўнікоў» уночы без дазволу адміністрацыі перанёс свае рэчы ў яшчэ ня высахшую ад фарбы кватэру. Спадабалася!

На заўтра ў заўкоме скандал.

— Высяліць нахабніка. На такую кватэру ахвотнікі знойдуцца!

Не цяжка ўявіць сабе якіх разьмераў быў гэты скандал. На камбінаце-ж 3.000 з усіх 4.000 рабочых ня маюць жыльля. Пабудаваныя за апошнія некалькі год бараки на пасёлку могуць задаволіць толькі 1.000 рабочых.

***

Беладзэрэўны цэх камбінату ператвараецца ў маладзёжны. За апошні час цэх адзе без прарываў. Райком камсамолу мабілізаваў 150 камсамольцаў у беладрэўны цэх. 8 верасьня мабілізаваныя павінны былі прыбыць. Дзе-ж разьмясьціць гэтую новую партыю рабочых? Адміністрацыя замяшалася, гаспадарнікі гатовы былі адмовіцца ад гэтага атраду, але... успомнілі Кільчэўскага.

— Дапамажы Іван Іванавіч, бяда: куды людзей пасяліць, зрабі, мілы, тры домікі.

Кільчэўскі быў задаволены. Ён бачыў, што яго работа ацэнена, што яна патрэбна краіне. І Кільчэўскі абяцаў да прыходу камсамольцаў сабраць 3 дамы...

***

Хронамэтрыст засёк час. Сэкундамэр паказаў 51,5 хвілін. Другая брыгада яшчэ ня прышла да фініпу. Толькі праз 9 хвілін пачулася:

— Гатова!

Гэта фініш узялі 4 цесьляры брыгады Арлова.

Закладка фундаманту, зборка ніжняй абшыўкі працягвалася 51,5 хвіліны. Кільчэўскі абыходзіў фундамант з ватэрпасам правяраў узровень, кантраляваў сшыўку:

— Добра!

Зборка 3-х дамоў Кільчаўскага праходзіла на аснове спаборніцтва. Плошча ля фізкультурнага стадыёну яшчэ ніколі ня бачыла такога сорту спаборніцтва.

Вось і іншыя паказьнікі. Сшыўка надворных шчытоў—брыгада Бабкова—4 гадзіны 52 хвіліны, брыгада Арлова—4 гадзіны 14 хвілін; загатоўка шалавых балак—брыгада Бабкова—54 хвіліны, брыгада Арлова—45 хвілін; зьбіўка столевых бэлек—брыгада Бабкова—2 г. 36 хв., брыгада—Арлова 2 г. 25 хв. Сшыўка столевых бэлек брыгада Бабкова—56 хв., брыгада Арлова—53 хвіліны.

Кільчэўскі трымаў у руках выразку з «За Индустриализацию» і паглядаў на гадзіньнік. І калі пачулася чарговае «гатова», ён моцна схапіў мяне за рукаў:

— Пабілі ўсесаюзны рэкорд па сшыўцы падлогаў. Вы чуеце, чуеце!

Ён працягнуў мне выразку, паказаў на сэкундамэр і крычаў.

— Бутусаў, Арлоў, малайцы! Такую работу люблю!

Усе 3 дамы Кільчэўскага былі сабраны ў 20 гадзін.

***

Той вывад, які адміністрацыя магла-б зрабіць пасьля перамогі тэхніка Кільчэўскага вельмі просты.

Цэх стандартных дамоў працуе з прарывамі. Вуглекопы Данбасу чакаюць жыльля. Завінаначанасьць камбінату вялізарная. У такім выпадку праект Кільчэўскага выратавальны круг.

Мы ні ў якім разе ня можам прапанаваць камбінату пераходзіць на стандарт Кільчэўскага. Для яго дому непатрэбна гэтага складанага абсталяваньня, якім уладае камбінат. Дом Кільчэўскага можна зрабіць на любым лесазаводзе. Складанае імпартнае абсталяваньне стандартнага цэху патрэбна скарыстаць на складаныя дэталі. Але тут-жа трэба даць месца і дому Кільчэўскага.

Гнуткасьць, хуткая дагаворанасьць з Данбасам і Стандартжылбудам, нескладаная перабудова ў цэху і Данбас можна літаральна заваліць жыльлём. Гэта не фантазія. Тут матэматычныя разьлікі.

Дом Камісарава—умяшчае 70 чалавек. Дом Кільчэўскага—60.

Дом Камісарава складаны, дом Кільчэўскага просты.

Дом Камісарава дарагі. Дом Кільчэўскага танны.

А калі дадаць да гэтага самае галоўнае, што выраб яго ў некалькі разоў хутчэй чым дому Камісарава, дык справа вельмі ясная...

Калі ў загадчыка стандартным цэхам Батукова спыталіся: «якая ваша думка аб магчымасьцях вырабу дамоў Кільчэўскага ў вас»?, дык Батуноў пераглянуўся з сядзеўшым побач інжынэрам Грудзіньным і ўсьміхаючыся адказаў:

— Выбачайце, вы бачылі дом Кільчэўскага? Паглядзіце ён у рабочым пасёлку!

— Я бачыў.

— Ну?!

— Калі скажуць рабіць яго дом, будзем рабіць...

З такім дзіўным раўнадушшам сустракаюць на камбінаце дом Кільчэўскага.

Замест баракаў на будаўніцтвах, замест тых-жа сумных вялізарных баракаў на торфараспрацоўках, якія пасьля сканчэньня сэзону разьбіраюць, дом Кільчэўскага мае поўнае права грамадзянства. Яму яны павінны ўступіць месца.

Калі пасьля ўсіх удалых вопытаў у Кільчэўскага спыталіся:

— Іван Іванавіч, ну а як далей?—тэхнік расказаў аб сваіх затоеных плянах. Гэта былі мары вынаходніка.

— Абвесьціце ў Менску конкурс. Няхай усе хто хочуць прывязуць свае дамы, і я прывязу. Няхай рабочыя паглядзяць і сваё ўражаньне запішуць у сшытак. А тады будзем выбіраць чый будаваць.

Ці так трэба будзе рабіць ці інакш, але вывад адзін. Дом Кільчэўскага мае права грамадзянства.

— Дарогу дому Кільчэўскага!

Б. Бялоцкі.



— Добры дом!

— Вагон!..

— Я пытаюся аб магчымасьцях яго пабудовы ў вас.

Мабілізацыя сродкаў—адна з асноўных задач саветаў

Забясьпечыць бесьперабойнае фінансаваньне сацыялістычнага будаўніцтва

Сураскі, Слуцкі, Лёзьненскі раёны ганебна адстаюць у выкананьні фінпляну. Лёзьненскі, Чашніцкі, Ельчыцкі і Камарынскі раёны апартуністычна адносяцца да спагнаньня сельгаспадатку з кулака. Раўняцца па Прыбарскім сельсавеце, які перавыканаў фінплян. Саветы, дэпутацкія групы і брыгады, уключайцеся ва ўсебеларускі конкурс на лепшае выкананьне фінпляну

Узьняць тэмпы выкананьня фінпляну III кварталу

Плян III-га кварталу па мабілізацыі сродкаў насельніцтва зацьверджаны для БССР у сяме 46 млн. руб., на 1-га верасьня выканан толькі на 48,5 проц.

Апошняя дэкада жніўня, хоць і дала ў параўнаньні з другой дэкадай жніўня ўзрост з 5 млн. да 6,6 млн. р., але гэты ўзрост яшчэ зусім не гарантуе 100 проц. выкананьня пляну.

Асабліва небясьпечнымі зьяўляюцца такія вучасткі пляну, як уклады ў ашчадкасы, дзе плян выканан на 19,5 проц. Гэты вучастак дае самы буйны прарыў. Замест 2 млн. прыліў за ліпень і жнівень ашчадкасы сабралі толькі 681 тыс. руб. Апошняя дэкада жніўня дае ў параўнаньні з другой дэкадай рэзкае зьніжэньне паступленьняў.

Гэта яшчэ раз сьцьвярджае, што ашчадны апарат апартуністычна адносіцца да выкананьня вельмі адказнай справы, якая даручана яму партыяй і ўрадам. Асноўная прычына гэтага прарыву заключаецца ў тым, што апарат ашчадкас у значнай сваёй большасьці не адпавядае патрабаваньням, якія да яго прад'яўляюцца, зусім не забясьпечвае пераатварэньне ашчадных кас у масавы крэдытны апарат, які абапіраецца ў горадзе і на вёсцы на шырокі грамадзкі актыў.

Арганізацыйныя формы і разьмяшчэньне ашчадкас па раёнах і сельсаветах не забясьпечваюць максымальнага эфэкту ў іх рабоце. У значнай сваёй частцы вясковыя касы зьяўляюцца агенцтвамі другога разряду і вытвараюць толькі прыём укладаў, адсылаючы ўкладчыкаў для атрыманьня укладаў «у раён», або суседні сельсавет.

Калегія Наркамфіну БССР даручыла кіраўніцтву ашчадкасамі вырашыць пытаньне аб арганізацыйнай форме вясковых кас, але кіраўніцтва мала зьвяртала ўвагі на выкананьне гэтага даручэньня НКФ і работа ашчадкас яшчэ не перабудавана.

Як і раней дрэнна выконваюцца планы рэалізацыі актый Трактарацэнтру і абавязацельстваў сельгасснабу. Абодвы пляны даюць за апошнюю дэкаду жніўня значнае зьніжэньне паступленьняў. Гэта яшчэ раз сьцьвярджае, што адносіцца да выкананьня вельмі адказнай справы, якая даручана яму партыяй і ўрадам. Асноўная прычына гэтага прарыву заключаецца ў тым, што апарат ашчадкас у значнай сваёй большасьці не адпавядае патрабаваньням, якія да яго прад'яўляюцца, зусім не забясьпечвае пераатварэньне ашчадных кас у масавы крэдытны апарат, які абапіраецца ў горадзе і на вёсцы на шырокі грамадзкі актыў.

Арганізацыйныя формы і разьмяшчэньне ашчадкас па раёнах і сельсаветах не забясьпечваюць максымальнага эфэкту ў іх рабоце. У значнай сваёй частцы вясковыя касы зьяўляюцца агенцтвамі другога разряду і вытвараюць толькі прыём укладаў, адсылаючы ўкладчыкаў для атрыманьня ўкладаў «у раён», або суседні сельсавет.

Калегія Наркамфіну БССР даручыла кіраўніцтву ашчадкасамі вырашыць пытаньне аб арганізацыйнай форме вясковых кас, але кіраўніцтва мала зьвяртала ўвагі на выкананьне гэтага даручэньня НКФ і работа ашчадкас яшчэ не перабудавана.

Асабліва небясьпечнымі зьяўляюцца такія вучасткі пляну, як уклады ў ашчадкасы, дзе плян выканан на 19,5 проц. Гэты вучастак дае самы буйны прарыў. Замест 2 млн. прыліў за ліпень і жнівень ашчадкасы сабралі толькі 681 тыс. руб. Апошняя дэкада жніўня дае ў параўнаньні з другой дэкадай рэзкае зьніжэньне паступленьняў.

Гэта яшчэ раз сьцьвярджае, што ашчадны апарат апартуністычна

Збожжазагатоўкі

Штодзённа ўзьнімаць тэмпы збожжазагатовак

Узмацніць націск на кулака. Памятаць, што „загатоўкі застаюцца ў гэтым годзе адным з рашаючых вучасткаў клясавай барацьбы на вёсцы“ (З паст. ЦК УсеКП(б)

Адсутнасьць складаў зрывае загатоўкі

Збожжа загатоўкі па Вушацкім раёне праходзяць марудныя тэмпамі. Да 1-га верасьня толькі калгас «Новы Шлях» і в. Лежня, Гарадзецкага сельсавету, здалі дзяржаве чырвоным абозам 42 цэнт. Астатнія калгасы разам з аднаасобным сэктарам Вясьніцкага і іншых сельсаветаў аб збожжазагатоўках зусім яшчэ нічога ня зрабілі. Не мабілізавалі ўвесь актыў вёскі на своячасовае правядзеньне гэтай кампаніі.

Ня лепш абстаіць справа па загатоўках сена і саломы, лёнасемя, лёнавалакна і іншых відаў культур. Глінскі сельсавет плян сеназагатовак на 1 верасьня выканаў на 6,2 проц., саломы на 2 проц. Асабліва дрэнна ідзе спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак. Па Сарочынскім сельсавеце наглядзецца такое зьявішча, што загатоўленае сена і салома больш як 50 тон ляжыць пад дажджом і гніе.

Загатоўкі лёнасемя і лёнавалакна па раёне яшчэ не распачаты. Толькі адзін калгас «Чырвоны Кастрычнік» арганізаваў чырвоны абоз 30-га жніўня і здаў дзяржаве 3 цэнт. лёнавалакна. Астатнія калгасы, а таксама і аднаасобны сэктар яшчэ зусім нічога не здалі.

У райспажыўсаюзе ёсьць усяго два склады, ў якіх будзе захоўвацца збож жа, але яны не падрыхтаваны для прыёмкі збожжа. Стары склад заняты рознай утыльсыравінай. Новы склад, які на сёньняшні дзень ужо прымае збожжа, яшчэ ня поўнасьцю адрамантаваны; калі ідзе дождж, дык у ім поўна вады. Такое-ж становішча са складамі ў райкаапсаюзе. Калі 30-га жніўня калгас «Чырвоны Кастрычнік» прывёз у Райкаапсаюз лёнавалакно і лёнасемя, дык яго ня было куды класьці.

Раённы камітэт партыі і РВК павінны прыняць тэрміновыя захады, каб падрыхтаваць неабходныя склады, а вінаватых у зрыве загатовак, прыцягнуць да адказнасьці.

К. Кароль.

Гніюць сотні пудоў збожжа

На ст. Цёмны Лес Зах. чыгункі, Горацкага раёну, каля чыгуначнага пак гаўза ссыпаюць збожжа. Як відаць збожам ніхто ня цікавіцца, бо склад, куды збожжа ссыпаецца, не адрамантаваны.

Загадчык гэтага ссыпнога пункту не адпраўляе збожжа, у выніку чаго больш тысячы пудоў збожжа там ужо згніло і парасло.

Такія адносіны да збожжа інакш нельга лічыць як шкодніцтвам з боку працаўнікоў ссыпнога пункту.

Трэба як найхутчэй праверыць ста новішча збожжа на станцыі Цёмны Лес, Заходняй чыгункі і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Брыгада студэнтаў Белдзяржвэтінстытуту.

Паклаліся на самацёк

КРУПКІ. Да загатовак збожжа ўжо засталося зусім мала часу. Ня гледзячы на пастанову ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня акруговыя раённыя загатоўчыя арганізацыі не прыступілі да падрыхтоўкі збожжазагатовак. Усе склады яшчэ не адрамантаваны як сьлед. Райкалгассаюз да гэтай важнай палітычна-гаспадарчай кампаніі не распачаў ніякай работы.

Па сельсаветах Крупскага раёну справа стаіць яшчэ горш. Тут нават ні слова аб збожжазагатоўках на вёсках не гаварылася. Ніводнага сходу на вёсцы не праведзена, Крупскаму раёну трэба пакласьці канец самацёку і апартунізму у Каапсаюзе і ва ўсіх загатоўчых арганізацыях.

Селькор.

Кандыдат на ганаровую прэмію

БАБРУЙСК, 12-IX. (Белта). 7 верасьня Міхалеўскі сельсавет, Бабруйскага раёну, арганізаваў другі чырвоны абоз з 160 фурманак і здаў Саюзхлебу 36 тон збожжа. Ён выканаў свае га давое заданьне на 30,5 проц. Сельсавет стаіць на першым месцы па збож жазагатоўках у Бабруйскім раёне і зьяўляецца першым кандыдатам на ганаровую прэмію газэты «Камуніст», райспажыўсаюзу і райвыканкому.

Раўняцца па перадавых

Бабруйск, 12-IX. (Белта). На 5 верасьня Глускі раён жнівеньскае заданьне па збожжазагатоўках выканаў на 108 проц. Калгасны сэктар жнівеньскае заданьне выканаў на 466 проц., аднаасобнікі 50,7 проц. Першымі па выкананьні збожжазагатовак ідуць Макавіцкі і Гарадкоўскі сельсаветы, выканаўшы жнівеньскае заданьне на 180 проц.

100 проц. звыш пляну

Калгас «Новае жыцьцё», Кадкаўска га сельсавету, Глускага раёну, ужо выканаў 90,5 проц. гадавога заданьня па збожжазагатоўках.

29-га жніўня на агульным сходзе калгасу калгасьнікі высунулі сустрэчны плян па здачы збожжа дзяржаве. І абавязаліся выканаць яго да 20-га верасьня.

Камісіі садзейнічаньня бязьдзейнічаюць

Ветка. (Белта). Збожжазагатоўкі па Веткаўскім раёне разгорнуты слаба. На 5 верасьня гадавы плян выкананы на 5,28 проц. Асабліва дрэнна ідзе спагнаньне па цьвёрдых заданьнях. На 5 верасьня паступіла ўсяго 2,84 проц.

Райкаапсаюз яшчэ слаба наладзіў свой загатоўчы апарат, не распрацаваў каляндарнага пляну здачы па сельсаветах, у выніку гэтага загатоўкі ідуць самацёкам.

Ёсьць сельсаветы якія яшчэ зусім не стварылі камісію садзейнічаньня, а там, дзе створаны, яны ня працуюць.

Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных для праядзеньня растлумачальнай работы на прадпрыемствах Менску па пытаньню супроць паветранай абароны

Прозьвішча	Дзе працуе	На якім прадпрыемстве прымацованы
Панчэнка	Камвуз	Зав. „Беларусь“
Пасквіч	„	Ф-ка „Камунарка“
Бранштэйн	„	Мясакамбінат
Азаровіч	„	Шчотачная ф-ка
Рагарэнка	„	Ф-ка „8 сакавіка“
Тбакоў	„	Хлебазавод
Гагалюк	„	База Мясбуду
Пасюк	„	Кр. Заря
Аўсеенка	„	Шпалерная ф-ка
Стрэльцаў	„	Пошта
Фуладзееў	„	Дзяржбанк
Юхно	„	Белдзяржснаб Менск. дадзяленьне
Палубінскі	„	Дрэнджавы завод
Гапоненка	„	„Ударнік“
Калтоўскі	„	Скорняжная
Шук	„	Чыгунка. Цяга
Лысенка	„	„ экспедыцыя
Барысевіч	„	„ Шлях
Будаеў	„	Малочны завод
Дуля	„	Палата мер-вагі
Каралюкоў	„	Кустпромсаюз
Макараў	„	„
Мелешка	„	Друк. „Сталіна“
Славін	„	„Беларуская“
Петкевіч	„	„Белкоопсаюз“
Южылка	„	Шкло завод „Пролетары“
Пабітка	КП(б)Б	Зав. „К мунар“
Грыцкевіч	„	Зав. „Варашылаў“
Шот	„	Ф-ка „Крупскай“
Фурсаў	Гор. КК	„ „Октябрь“
Кулінёнка	„	„Бальшавік“
Навасёлаў	ОАХ	Чырв. Тэкстыльшчык
Хачэва	„	Фармававод
Даўнес	„	Эльвод
Худыш	ЛКСМБ	Транспартрэст
Аст оўскі	ВОХР	Д. А.
Янковіч	ЛКСМБ	Обувная ф-ка

ПАМЯЦІ КАМАНДЗІРАЎ

Рэвалюцыйны Вайсковы Савет Саюзу ССР з вялікім жалем паведамляе аб пагібелі, пры выкананьні службовых абавязкаў, двух выпрабаваных заслужаных і баявых камандзіраў РСЧА

Інспэктара вайскова-паветраных сіл, тры разы ўзнагароджанага ордэнам Чырвонага сьцягу,

тав. МЕЖАРАЎП Пятра Хрыстафоравіча

і старэйшага памочніка інспэктара ВПС

тав. ПІСАРЭНКІ Віктара Іёсіфавіча

Яшчэ больш увагі савецкай авіацыі

9-га верасьня пры выкананьні службовых абавязкаў трагічна загінулі два большавікі-камандзіры РСЧА, два актыўных удзельнікі грамадзянскай вайны, вядомыя лётчікі.

Тав. Межараўп П. Х.—сын селяніна, нараджэньня 1895 г., з 1915 г. працаваў у авіацыі ў якасьці матарыста. У 1917 г. ён прымаў актыўны ўдзел у прыдушэньні юнкераў і афіцэраў у Маскве, пасьля працаваў у Чырвонай гвардыі і далей у Чырвонай арміі, займаючы рад адказных пасад у Чырвоным паветраным флёце.

За цэлы рад асабістых гераічных учынкаў на франтох Урангеля, Махно, паўночным, басмацкім—**тав. Межараўп узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонага сьцягу, ордэнам Бухарскай Чырвонай зьвязды, ордэнам Харэзмскай рэспублікі, ордэнам Афганскай дзяржавы, граматай УсеУЦВК і званьнем заслужанага лётніка.**

З 1930 году Пётр Хрыстафоравіч зьяўляўся інспэктарам ВПС РСЧА.

Тав. Межараўп у 1924 г. зрабіў пералёт у Афганістан праз Гіндукуш. У 1927 годзе ён зрабіў усім вядомы палёт з Масквы ў Анкару, сталіцу Турэччыны, праз Чорнае мора на сухапутным самалёце.

Тав. Пісарэнка В. І.—сын рабочага, нараджэньня 1897 г. З 1920 году ён атрымлівае званьне лётніка. Ён актыўна ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне пад камандай тав. Межараўпа. Апошнія гады быў старэйшым памочнікам інспэктара ВПС РСЧА.

Гібель гэтых таварышоў вялікая страта для Чырвонай арміі, для савецкай авіацыі.

Працоўныя Беларусі павінны з падвойнай энэргіяй, з падвойнай напружанасьцю рабіць тую справу, на якую аддалі свае сілы загінуўшыя таварышы.

Зараз нам добра ўспомніць словы, якія сказаў намесьнік старшыні Рэўваенсавету СССР тав. М. Н. Тухачэўскі на грамадзянскай паніхідзе па загінуўшых 8 камандзіраў у ліпені месяцы:

«Самалёт і матор—вось тая сіла, якая будзе стаяць на варце Кастрычніка. Панесеная страта яшчэ больш мабілізуе нас на ажыцьцяўленьне тых задач, над якімі працавалі паўшыя таварышы».

Працоўныя Беларусі бязумоўна гэтыя пажаданьні выканаюць, яшчэ больш павялічыўшы ўвагу вывучэньню і ўзмацненьню вайсковай тэхнікі і асабліва авіяцыі.

М. Х.

Пастанова прэзыдыуму ЦСПСБ

аб удзеле праф. арганізацый у правядзеньні ўсебеларускага месячніка стандартызацыі

Адзначаючы вялізарнейшае значэньне сацыялістычнай стандартызацыі ў справе рэканструкцыі прамысловасьці і сельскай гаспадаркі і неабходнасьць папулярызацыі сярод шырокіх рабочых мас задач па ўкараненьні стандартызацыі ва ўсе галіны нар. гаспадаркі,—Прэзыдыум ЦСПСБ **пастанаўляе:**

1. Абавязаць саюзныя арганізацыі забясьпечыць шырокі ўдзел рабочых, ІТР і служачых на прадпрыемствах у правядзеньні месячніка стандартызацыі, абвешчанага СНК БССР ад 6 верасьня да 6-га кастрычніка.

2. Для азнаямленьня рабочых мас з мэтай—устаноўкай месячніка, прапанаваць Менскаму, Гомельскаму, Віцебскаму і Магілеўскаму ГРПС паставіць пытаньне аб стандартызацыі на агульнагарадзкіх зьлётах ударнікаў-брыгадзіраў узорнай якасьці, рацыяналізатарскіх ячэек і вынаходцаў, рэдактароў шматтыражак і насьценгазэт, мабілізуючы ўвагу рабочых на забясьпячэньне рэалізацыі праграмы месячніка.

3. Прапанаваць ЦП і ФЗМК разгарнуць работу па сыстэматычным абгаварэньні практычных пытаньняў стандартызацыі на вытворчых нарадах.

4. Прапанаваць ЦП Маш.-Буд., швэйнікаў, скурнікаў, керамічнай прамысловасьці, Лесдрэўрабочых, мук.-хлебнакандыт., земляробчых саўгасаў, МТС, раб. каапэрацыі і дзяржгандлю вылучыць сваіх прадстаўнікоў у адпаведныя Штабы па правядзеньні месячніка пры ВСНГБ, Наркамснабу, Наркамзему, НК Асьветы і БКС.

На бліжэйшым паседжаньні Сакрата рыяту заслухаць інфармацыі вышэйпамянёных ЦП аб фактычным удзеле ў правядзеньні месячніка.

Ва Ўсебеларускі Штаб па стандартызацыі вылучыць прадстаўнікоў ад ЦСПСБ—тав. Ханчына.

ЗВОДКА

калектывізацыі, уборкі і апрацоўкі лёну, сіласаваньня кармоў, сяўбы азіміны і зяблевага зрыва па раёнах БССР (без саўгасаў) на 10 верасьня 1931 г.

Назва раёнаў	Процант калектывізацыі	Уборка лёну ў проц.	Абмалоч. да выцер. у проц.	Разаслана і замочан. да выцер. у проц.	Сіласаван у проц.	Сяўба азіміны ў проц.	Зорыва зябу ў проц.
Брагінскі	42,1	100,0	49,0	49,0	24,2	9,9	9,7
Буда-Кашалёўскі	43,8	100,0	93,7	93,7	8,2	36,2	4,9
Бабруйскі	25,8	93,0	91,0	91,0	8,0	47,0	5,9
Веткаўскі	29,0	100,0	72,9	72,9	6,9	13,9	2,3
Глускі	43,5	100,0	71,1	71,1	7,4	30,0	10,4
Гомельскі	30,9	67,0	65,8	65,8	25,4	2,2	1,7
Жыткавіцкі	47,1	100,0	93,3	93,3	24,7	2,9	10,8
Жлобінскі	31,5	100,0	82,7	82,7	11,8	28,7	0,8
Кармянскі	44,8	100 0	94,5	94,5	8,0	48,0	—
Камарынскі	50,0	100,0	22,0	2,2	42,7	15,9	1,0
Ельскі	49,7	100,0	100,0	100,0	15,2	13,5	2,7
Лоеўскі	46,5	100,0	95,9	94,5	11,0	35,4	7,2
Любаньскі	43,2	100,0	96,3	96,3	10,6	5,6	14,7
Лельчыцкі	26,3	100,0	76,5	76,5	5,2	12,3	—
Мазырскі	37,5	99,7	100	100	11,5	36,8	18,5
Нараўлянскі	29,3	100,0	26,7	26,7	1,6	1,3	—
Парыцкі	36,6	90,9	85,1	85,1	7,0	45,4	—
Петрыкоўскі	26,7	99,8	73,1	73,1	8,6	30,8	18,4
Рагачэўскі	82,2	100,0	93,7	91,4	10,1	5,2	0,9
Рэчыцкі	35,0	100,0	97,5	52,1	1,0	0,5	0,4
Слуцкі	57,5	99,0	79,8	95,3	17,0	6,3	4,8
Старобінскі	44,4	100,0	99,2	99,2	6,4	24,9	8,4
Стародарожскі	31,0	83 0	26,5	26,5	3,4	5,9	2,7
Тураўскі	44,2	90,1	92,5	92,5	14,4	0,8	10,4
Церахаўскі	31,4	100	74,1	69,5	9,9	14,0	2,2
Чачэрскі	34,4	100	100	100	39,4	62,3	—
Чырвона-Польскі	50,3	100	98,4	97,5	16,9	38,9	—
Чырвона-Слабодз.	38,0	87,4	63.7	61,7	4,5	50,3	17,8
Уваравіцкі	32,3	100	58,0	50,1	4,0	11,1	0,2
Хойніцкі	45,4	100	50,3	50,3	6,6	22,8	2,5
Асіпавіцкі	37,7	100	67,7	57,6	6,8	35,1	0,9
Быхаўскі	35,5	100	53,0	39,6	6,5	25,1	—
Барысаўскі	40,3	82,4	34,8	34,8	21,8	51,6	27,5
Бялыніцкі	49,6	100	31,8	31,8	—	57,4	2,2
Бягомльскі	71,3	50,5	21,3	20,6	14,8	34,3	—
Бярэзінскі	40,1	100	90,7	89,2	0,2	41,9	1,4
Горацкі	52,1	99,5	8,7	8,4	20,7	30,2	1,7
Заслаўскі	55,7	94,0	77,6	52,1	5,7	42,6	5,6
Клімавіцкі	80,5	100	58,2	49,9	30,4	50,7	22,2
Крупскі	52,1	99,5	100	79,9	7,9	63,6	0,3
Копыльскі	59,3	99,1	53.8	53,8	6,0	23,7	5,4
Касьцюковіцкі	74,1	94,9	100,0	100,0	6,5	31,1	0,6
Клічаўскі	40,7	100	100	68,4	3,1	28,2	—
Койданаўскі	93,0	91,4	40,3	17,3	25,7	27,1	10,1
Крычаўскі	65,5	100	63,6	61,5	12,9	32,5	2,1
Лагойскі	59,5	96,6	84,0	76,0	11,0	66,9	6,1
Магілеўскі	34,4	92,9	76,4	66,8	6,6	43,7	9,9
Мсьціслаўскі	69,6	97.4	44,8	39,6	27,1	38,2	3,8
Менскі	66,7	100	1,1	—	11,9	54,6	29,9
Прапойскі	58,8	100	80,2	60,2	4.8	39.4	8,9
Пухавіцкі	32,6	96,6	85,8	67,0	8,1	11,8	2,1
Плешчаніцкі	48,9	60,3	41,0	31,7	12,9	23,7	0,2
Смалявіцкі	43,7	100	78,1	70,3	18,4	45,0	9,2
Талочынскі	70,5	93,6	28,2	28,2	17,1	41,2	1,0
Чэрвеньскі	38,0	99,2	79,8	70,6	4,7	61,4	3,1
Чавускі	35,0	100	93,1	92,0	2,7	35,9	—
Чэрыкаўскі	69,3	100	91,1	83,8	6,0	53,1	1,7
Шклоўскі	50,8	100	86,3	44,2	15,7	66,2	10,1
Ўзьдзенскі	54,8	100,0	58,7	36,5	1,5	21,6	14,0
Асьвейскі	46,8	96,1	87,0	87,0	6,3	18,4	11,9
Аршанскі	60,6	89,0	59,9	59,9	23,2	68,1	1,5
Бешанковіцкі	50,6	93,8	66,3	37,5	4,4	41,9	—
Віцебскі	62,6	100,0	90,5	90,5	25,2	52,6	—
Вушацкі	58,0	100,0	—	—	8,9	81,2	—
Гарадокскі	50,7	99,9	85,9	81,7	13,4	99,0	—
Дубровенскі	48,4	87,1	61,6	34,9	11,6	50,1	3,3
Дрысенскі	58,2	91,0	91,4	88,6	17,1	43,2	2,5
Лёзьненскі	60,4	100,0	94,1	94,1	17,8	96,4	3,1
Лепельскі	83,0	99,5	35,7	34,9	10,7	41,0	1,3
Полацкі	57,6	95,0	92,2	92,2	23,9	38,5	1,9
Расонскі	38,3	96,0	91,2	42,9	5,6	70,5	1,6
Сураскі	44,3	96,3	85,5	85,5	31,1	91,4	31,8
Сенненскі	66,5	100,0	59,2	48,8	15,4	37,9	2,5
Сіроцінскі	59,5	100,0	74,1	66,8	35,5	77,2	6,1
Чашніцкі	61,9	83,3	50,5	50,5	5,8	38,8	0,2
Па БССР	48,3	95,8	71,3	63,3	12,4	38,3	5,2

Дапаможам вязьням фашысцкай турмы

ПУХАВІЧЫ (Белта). Узьлянская ячэйка МОПР'у ў адказ на зьверскія зьдзекі над палітзьняволенымі ў турмах фашысцкай Польшчы заяўляе свой пратэст супроць гэтых нячуваных у гісторыі зьдзекаў. Калгасьнікі ўнесьлі 165 руб. 40 кап. у райком МОПР'у для дапамогі сем'ям палітзьняволеных і выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсе ячэйкі МОПР'у Пухавіцкага раёну.

Адказны рэдактар: П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева. Апошнія 3 спэктаклі. Кірмаш навест. Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

АПОШНІЯ 2 ТЫДНІ — Сёньня ранішнік М-ль НІТУШ. Зьніж. 50 проц. Пачатак а 1 гадз. дня. ДЗЯРЖЦЫРК. Лепшыя ў СССР Клео Дароці, жанчына ілюзіяністка. Заслужаныя артысты ССРГ бр. Танці. Муз. сат. замежная артыстка Вольга Мазава. Жанглёры-малабарыстых Бэуман і Мяцблін. Лепшыя ў СССР атракцыёны-суцьветны пэкоэда-плаваньне ў паветры б. Зьворці 6. Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2. 5 Богадэ 5 акрабаты. Турністы 3 Марос 3. Новая групавая дрэсыроўка коняй А. В. Лапіда. Выезд пагрыбнянскіх наезьнікаў жакеяў 4 КУК 4. Музычны інструменталіст Вероніка. Выезд наезьніка Пэрвіль. Спарт. акрабаты Веомаш. Універсальныя артысты бр. МАКЕЕВЫ. Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе. Пачатак а 9 гадз.

Кіна-тэатр Культура — З 10 верасьня вялікі замежны мастацкі фільм вытворчасьці драматыўс.—фільм. вып. 1931 г. „Шчасьце матулі Краузэ“ ў 7 част. Рэж. і апэр. Піль-Ютун

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Мастацкі фільм ХАЗ ПУШ. Пачатак дзённага сэансу а 2, 3-30, веч. а 7, 8-40, 10-30.

Кіно „Пралетары“ — ПАДАЗРОНЫ БАГАЖ

„Чырвоная Зорка“ — З 15-га верасьня Дуглас Фэрбенкс сын Зорро. Каса з 5 гадз. Цэны паніжаны.

СЭКТАР КАДРАЎ ОРУ

АРГАНІЗУЕ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКАВОДАЎ для сыстэмы Белсампрамсаюзу

Слухачы забясьпечваюцца стыпэндыяй—50 р. у м-ц (Інтэрнатам не забясьпечваюцца)

Па сканчэньні курсаў абавязацельства працаваць 2 гады ў сыстэме Белсампрамсаюзу.

На курсы прымаюцца калгасьнікі, утрыманцы рабочых, служачых і саматужнікаў.

Да заявы далаць дакументы: аб асьвеце (ня ніжэй 5 груп), аб сацыяльным становішчы, аб узросьце і аб праве голасу.

Адрас: Менск, канцылярыя курсаў ОРУ (Савецкая, 55, уваход з двара) ад 10 да 12 гадз. дню.

Заявы прымаюцца да 1-га кастрычніка

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

НАРОДНЫМ КАМІСАРЫЯТАМ ФІНАНСАЎ БССР

на падставе арт. 2-4 палажэньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі ад 9 лютага 1931 г. № 109 (Збор Законаў і Загадаў СССР № 8, пастанова 99)

ЗАРЭГІСТРАВАНА Ў РЭЕСТРЫ ЮРЫДЫЧНЫХ АСОБ ЗА № 85

АУТАНОМНАЯ ТАРФЯНАЯ СЭКЦЫЯ ПРЫ БЕЛКААПСАЮЗЕ

МЕСЦА ЗНАХОДЖАНЬНЯ СЭКЦЫІ:

Менск, Савецкая, 103-13 кант-рах. у Дзяржбанку № 68-954

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

11 верасьня 1931 г. № 31 гор. Менск.

АБ ПАДТРЫМАНЬНІ ЧЫСТАТЫ Ў гор. МЕНСКУ

Менскі Гарадзкі Савет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць уласьнікаў дамаўладаньняў, знаходзячыхся на Ленінскай вул. ад пачатку да Карла-Маркса, Савецкай ад пачатку да Энгельса, Карла Маркса ад пачатку да Чырвонаармейскай, Камсамольскай ад Інтэрнацыянальнай да Карла Маркса, Інтэрнацыянальнай, Валадарскай да Карла Маркса—мець у дамаўладаньняў на тротуарах у ны, устаноўл нага ўзору, для скідваньня сьмецьця (акуркаў, паперы і інш.).

2. Урны павінны заўсёды знаходзіцца ў чыстым выглядзе і штодзённа ачышчацца ад сьмецьця.

3. Абавязаць усіх грамадзян, праходзячых па вуліцах, пералічаных у п. 1 гэтай абавязковай пастановы, усе сьмецьце (акуркі, паперы і інш.) кідаць выключна ва ўстаноўленыя каля дамаўладаньняў урны.

4 Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасьці штрафу ў разьмеры 2 р., спагнанага міліцыянэрам на месцы парушэньня, а ў выпадку адмовы складаецца пратакол для налажэньня штрафу да 25 р., альбо 7 дзён прымусовай работы.

5. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскладаецца на міліцыю.

6. Гэтая абавязковая пастанова набывае моц праз 5 дзён з дня абвяшчэньня.

Старшыня Менгарсавету ВАЛОДЗЬКА. За сэкратара ТАРАСІК.

Прафком, адміністрацыя і калектыў студэнтаў і настаўнікаў беларускіх дзяржаўных драматычных курсаў з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці супрацоўніцы курсаў

НАДЗЕІ ЯКУБАЎНЫ МАРКОВІНАЙ

Гомельскі хэміка-тэхналёгічны тэхнікум грамадзкага харчаваньня

ПРАЦЯГВАЕ АСЕНЬНІ ПРЫЕМ студэнтаў на 1 асноўны і на падрыхтоўчы курс

Тэхнікум рыхтуе спэцыялістаў сярэдняй кваліфікацыі ў галіне грамадзкага харчаваньня (тэхнікаў-эканам стаў, тэхнікаў-лябарантаў, тэхнікаў-тэхналёгаў)

На асноўны курс прымаюцца асобы, з ведамі за сямігодку, ва ўзросьце 17—30 год. Для нясканчыўшых сямігодку або скончыўшых такія раней 1929 г. утвараюцца прыймовыя іспыты. На падрыхтоўчы курс прымаюцца асобы з ведамі за 5-6 груп сямігодкі.

Прынятыя ў тэхнікум будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам, як і ў іншых індустрыяльных тэхнікумах.

Да заявы прыкладаюцца дакументы пералічаныя ў правілах прыёму ў тэхнікумы. Заявы прымаюцца да 25 верасьня. Дакументы накіроўваць па адрасу: Гомель, Лісьцвянская вул., д. 4, Дырэктару Тэхнікуму

БЕЛКААПХАРЧ

БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЕ

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА

ўстаноў, прадпрыемстваў і інш. арганізацый, што на падставе абежніка „СЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЯ“, у цэнтральным апараце Канторы „Белсельгасснабжэньне“ устанаўляецца адзіны для ўсіх працаўнікоў выходны дзень: 4, 9, 14, 19, 24, 29 кожнага месяца

„БЕЛСЕЛЬГАССНАБЖЭНЬНЕ“

БЕЛДЗЯРЖКІНО

праводзіць кансультацыю па фільмавай справе ў наступныя дні: 13, 15, 18 і 20 з 4 да 6 гадзін увечары ў памяшканьні Праўленьня Белдзяржкіно (Савецкая, 90)

Белдзяржкіно

ЗЬБЕГ КОНЬ

цёмна-гнядой масьці, 5-ці год, з саўгасу „1-га Мая“, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну. Просьба ведаючых паведаміць па адрасу: Астрашыцкі-Гарадок 9 вуч. Бельсельбуд

Праўленьне шавецкай арцелі ў м. Бярэзіна. Даводзіць да ведама заказчыкаў, што выдаленыя бляшаныя нумары на папраўку абутку маюць моц да 1 га кастрычніка г. г. Пасьля гэтага тэрміну ня выкуплены абутак будзе прадаваецца з таргу. ПРАЎЛЕНЬНЕ

Інстытут Саўбуд і Права паведамляе, што ЗАНЯТКІ НА 2 КУРСЕ (вячэрняе аддзяленьне) пачнуцца 21 верасьня а 5 гадз. 25 хв. увечары ў прыродазнаўчым корпусе. Дырэкцыя

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—5 р., —год—12 руб.

Галоўлітбел № 598. Друкарня імя тав. СТАЛІНА.